Paśla kanfiskaty

Шлях Моладзі

Šlach Moładzi

…„Падыймайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі."

ЯНКА КУПАЛА.



№ 9 (108) Vilnia, Žnivień 1937 h. Hod IX.

UVAHA! NOVAŚĆ! UVAHA!

Cennyja premii dla akuratnych padpiščykaŭ „Šlachu Moładzi"!

Niabyvałaja akazija zusim darma vyjhrać hadzińnik, sekatar, nažy da ščapleńnia dreŭ, cennyja knižki i inš. rečy.

Administracyja „Šlachu Moładzi" pastanaviła sioleta vosieńniu raździalić miž akuratnych svaich padpiščykaŭ premii za ichniuju dbajnaść. Premii buduć padzieleny darohaj losavańnia, da jakoha buduć dapuščany tolki tyja padpiščyki, katoryja apłacili, abo jašče apłaciać padpisku na „Šlach Moładzi" za hety sioletni 1937 h. (usiaho tolki dva złotyja).

Śpis hałaŭniejšych premijaŭ:

1. Dobry hadzińnik na ruku.
2. Sekatar (nožnicy da abrazańnia halinak dreŭ).
3. 2 nažy da ščapleńnia dreŭ.
4. „Гісторыя (Беларускай) Крыўскай Кнігі" В. Ластоўскага, якая ў прадажы каштуе 10 зл.
5. „Пчолы" — кніга аб пчалаводзтве Пачопкі.
6. „Гісторыя Беларускай Літаратуры" М. Гарэцкага.
7. „Географія Беларусі" Смоліча.
8. „Хрыстаматыя Беларускай літаратуры" Дварчаніна.
9. Hramafonnaja plitka z biełaruskim narodnym tancam «Lavonicha» i z pieśniaj „A u lesie, lesie" ŭ vykanańni słaŭnaha tenara M. Zabejdy-Sumickaha.
10. Partret biełaruskaha paeta M. Bahdanoviča.

Apračа hetaha hatujem niespadzieŭku ŭsim akuratnym padpiščykam.

Dyk chto choča być u liku dapuščanych da losavańnia premijaŭ, niachaj zaraz pastarajecca apłacić padpisku. Chto-ž padpiski nie apłacić, toj nia budzie pryjmać udziełu ŭ losavańni i tamu vysyłka „Šlachu Moładzi" budzie strymana!

Treba pamiatać, što svaja presa, svaje časapisy, najlepš baroniać i infarmujuć. Tamu, biełarusy pavinny padtrymlivać svaju presu i pašyrać jaje, zdabyvajučy novych padpiščykaŭ. Biełaruskaja moładź pavinna pieradusim vypisvać i pašyrać „ŠLACH MOŁADZI"!

Hety numar „Šl. Mol." maje 16 bačyn, nastupny budzie jznoŭ pabolšany da 24 bačyn, a kali padpiska budzie nadchodzić akuratnа, to budziem staracca „Šlach Moładzi" vydavać čaściej.

Administracyja „Šlachu Moładzi."

„Шлях Моладзі"

МЕСЯЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Падпіска на 1 месяц 20 гр.; на 3 месяцы 50 гр., на паўгода — 1 зл., на год — 2 зл.

Заграніцу — ўдвая даражэй.

Адрыс Рэдакцыі: Вільня (Wilno), Завальная вуліца № 1—2.

Шлях Моладзі

ІЛЮСТРАВАНЫ МЕСЯЧНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Год IX. Вільня, Жнівень 1937 г. № 9 (108).

Міхась Машара

У САДЗЕ.

Зацьвіцелі ў садзе краскі.
Цягне выш траву усю.
Перагудай дзіўнай казкі
бродзіць шолах па гальлю.

Рукі пахнуць дзікім мёдам,
ад расы і соку траў.
Як дзяўчыну, каля плоту
хмель ляшчыніну абняў.


Плямай цень залёг пад дрэвы.
Уюцца ў сонцы матылі.
Ў сэрца дзіўныя напевы
з даляў сініх прыплылі.

Усё забыў...
Усё далёка...
Сонца, хмель, кусты і я, —
толька там, ў душы глыбока,
Беларусь — туга твая.

І здаецца мне, што звоніць,
не з вятрамі лісьцем клён,
а зьвініць прызыў Пагоні, —
твой завоблачны разгон.

І я, зноў ісьці гатовы
на шляхі зьнямог цяжкіх,
і як зоры, сеяць словы
ў душы сонных і глухіх.

Вісяты 1.VII.37.



Z błudnaha koła polska-biełaruskich adnosinaŭ

(Z pryčyny źjezdu viaskovaha sektaru OZN u Vilni).

Dziŭna sapraŭdy ŭkładajucca polska-biełaruskija adnosiny. Ad samaha pačatku isnavańnia adrodžanaha Polskaha Haspadarstva adnosiny hetyja nijak nia mohuć uzyjści na pravilny šlach. Pa roznych abiacankach, pertraktacyjach i kombinacyjach z 1919-20 h., praz arhanizavańnie štučnych biełaruskich polonofilskich hrupkaŭ, jakija pieravažna mieli svaje pačatki i kancy ŭ vajavodzkich načalnikaŭ biaśpiečnaści, dalej panuje chaos. Nia možna, praŭda, skazać, kab nia było sprobaŭ hetaje tak važnaje spravy ŭładzić. Byli ludzi idejovyja, byli sproby jak adzinak tak i hrupaŭ, imknieńniem katorych było vyjšci z henaha błudnaha koła, adnak usio niejak hłochła i biaz šyrejšaha recha hinuła siarod endeckich i Cat-Mackievičaŭskich krykaŭ ab asymilacyi. Nie siahajučy ŭ dalejšuju minuŭščynu, chočam z žalem śćvierdzić likvidacyju ŭ Vilni sioleta časapisu „Naprzełaj", katory hurtavaŭ kala siabie starejšych polskich skaŭtaŭ, da biełaruskaj spravy padchodziŭ davoli pavažna i paśla kanfiskaty druhoha numaru, za artykuł ab Biełarusach i biełaruskaj kulturnaj pracy, *tajomnym sposabam pamior...* Na likvidacyju hetaha časapisu zvaročvajem uvahu i acaniajem jaje adjemna, asabliva dziela taho, što časapis „Naprzełaj" vyjaŭlaŭ zdarovyja dumki *maładoha polskaha pakaleńnia*. Paśla hetaha byli jšče sproby z boku polskich vilenskich demakrataŭ, a miž inšym i z boku „Kurjera Powszechnego", uvajšci ŭ kantakt z Biełarusami i pracavać dziela dabra supolnych polska-biełaruskich adnosinaŭ, ale j hetuju sprobu niejkaja tajomnaja ruka zahłušyła(?)...

Niadaŭna, bo tolki 15.VIII sioleta, davoli cikavyja adnosiny da Biełarusaŭ vyjavilisia na źjeździe viaskovaha sektaru „Obozu Zjednoczenia Narodowego" (OZN) Vilenskaha vajavodztva, dzie, praŭda, mimachodam kiraŭnik hetaha sektaru hienerał Galica ŭ pramovie da ŭčaśnikaŭ źjezdu ŭspomniŭ i ab Biełarusach. Havaryŭ jon hetak:

„Što da biełaruskaha narodu, katory supolna z Vami zasialaje hetuju ziamlu, Deklaracyja našaha Obozu daje Vam vyraznyja pakaźniki. Adnosiny z hetym narodam pavinna charektaryzavać achvota ŭładžańnia bratniaha sužyćcia, apiortaha jak na supolnaj histaryčnaj minuŭščynie, tak i na padstavach zahvarantavanaha Haspadarstvam dla hramadzian prava. Zdabyvańnie lepšych žyćciovych varunkaŭ, u hranicach jahonaha zhodnaha haspadarčaha sužyćcia z polskim narodam, lažyć tut u intaresie našaha Haspadarstva, katoraje svajej siłaj usich tutejšych hramadzian adnolkava abaraniaje".

Voś-ža, kali chodzić ab Biełarusaŭ, to Biełarusy, vykonvajučy adnosna Polščy ŭsie haspadarstviennyja abaviazki i nia hledziačy na pierażyvanyja niahody, a taksama i na toje, što sarhanizavanaja jšče za časoŭ niamieckaje akupacyi i paśla (da 1922 h.) šyrokaja sietka biełaruskaha školnictva była źlikvidavanaja — nidzie i nikoli na dobryja i spraviadlivyja imknieńni i pažadańni Palakoŭ voŭkam nie adhuknulisia. Kali-ž chodzić ab adnosiny ŭčaśnikaŭ źjezdu da pažadańniaŭ hien. Galicy ŭ biełaruskaj spravie, to choć jany i spatkali ich hromkimi vopleskami, to faktyčna pavažna pad uvahu ich nia brali. Naadvarot,

učaśniki źjezdu vyrazna raźminalisia z pažadańniami hien. Galicy, jašče bolš i hramčej vitajučy pramovu dr. J. Kurkoŭskaha, kiraŭnika viaskovaha sektaru OZN u Pastaŭskim paviecie, jaki miž inšym ćvierdziŭ, što buduć pracavać z vieraj u toje:

...„što ŭłady Haspadarstviennyja (Państwowe), a znača Administracyja, Sudy i Vojska buduć ačyščanyja ad elementaŭ niapolskich";

„što zabiaśpiečany budzie pierachod ziamli parcelavanaje pry vykonvańni zakonu ab ziamielnaj reformie, da novych ułaśnikaŭ vyklučna polskaj nacyjanalnaści..."

„Heta jość —kazaŭ jon dalej— padstavy, katoryja vypłyvajuć z prahramy pałkoŭnika Koca i adnačasna najbolš lažać nam na sercy"...

Dyk voś jak kiraŭniki OZN na „Kresach Wschodnich" majuć układać braterskija adnosiny... A školnyja ŭłady, jak piša p. V. Charkievič u № 233 z dn. 24.VIII.37 „Słowa", pačali zvalniać z pasad pieradusim vučycialoŭ pravasłaŭnych, žycharoŭ hetaha kraju, katorych navat jon, zaličajučy da Biełarusaŭ, baronić. Paśla hetaha ŭsio jasna... Jasna, tak-ža, i havaryć ab hetym šmat nia treba, što pry dobraj achvocie... kožnamu žycharu našaje vioski—za vyniatkam abšarnikaŭ, asadnikaŭ i chiba ŭradaŭcaŭ, jakija badaj tolki i byli prysutnymi na źjeździe OZN u Vilni, — možna dakazać, što jon nacyjanalnaści nia polskaj... Nia treba chiba havaryć, da čaho takija namiery mohuć daviaści i što musiać vyklikać...

Cikavaja była tak-ža na źjeździe spaściaroha kiraŭnika viaskovaha sektaru OZN na Vilenskaje vajavodztva inž. S. Pežanoŭskaha ab vioscy ŭ Vilenščynie. Jon kazaŭ:

„Zastrašajučy ŭzrost prastupstva na vioscy, vyjaŭleny ŭ niepašanavańni majemaści i žyćcia ludzkoha, lohkavažańnie praŭnaha paradku i niezrazumiełaja nienaviść da prajavaŭ kultury — heta aścierahajučyja znaki, što znachodzimsia na błudnaj darozie, z katoraje zaraz-ža musim znajści vychad"...

J. N.

Da vytokaŭ biełaruskaha adradžeńnia

Kožny čałaviek imkniecca pierad usim paznać historyju svajho narodu i narmalna znajomicca z joj užo z małych hadoŭ u pačatkavaj škole. Biełaruskaja moładź nia majučy, nažal, adpaviednaj kolkaści i naležna pastaŭlenych svaich biełaruskich školaŭ, znachodzicca ŭ takich abstavinach, što faktyčna nia maje narmalnaha sposabu paznavańnia svaje historyi. Dziela hetaha prychodzicca rabić nam heta samatužna, nia pry pomačy vučycialoŭ, dy školnych padručnikaŭ, z jakich zmahli biełarusy ŭ Polskaj Dziaržavie vydać tolki adzin *„Каротки нарыс гісторыі Беларусі“* praf. U. Ihnatoŭskaha, ale najčaściej z drukavanych u biełaruskaj presie artykułaŭ i biełaruskich knižak na histaryčnyja temy. I dziela hetaha „Šlach Moładzi“ zaraz, jak tolki pačaŭ vychodzić, paśviačaŭ mnoha miesca historyi Biełarusi, jakoj isnavańnia tak časta našy vorahi starajucca zapiarečyvać. Voś-ža spačatku drukavali my na bačynach „Šlachu Moładzi“ cely rad artykułaŭ M. Pieciukieviča, Vah'a i V. H. pad ahulnym nazovam *„Krychu z našaj historyi“*. Artykuły henyja dali, praŭda, nie abšyrny, narys historyi Biełarusi, ad samaha jaje pačatku—ad razsialeńnia narodaŭ,—raźvićcio biełaruskaha narodu, słaŭnyja časy Vialikaha Kniastva Litoŭska-Biełaruskaha, „załatuju paru“, kali mova biełaruskaja panavała nia tolki siarod sialan, ale i na kniazioŭskich pasadach i kali zakony byli pisanyja pabiełarusku,—až da Lublinskaj Unii z Polščaj. Paśla hetaha drukavałasia ŭ „Šl. Mł.“ praca viedamaha biełaruskaha dziejača Ad. Stankieviča p. n. *„Da historyi biełaruskaha palityčnaha vyzvaleńnia“*, jakuju vydali my addzielnaj knižkaj i jakaja dała narys adradženskaj biełaruskaj pary ad 1832 h. až badaj da 1933 hodu.

Takim čynam, da bolš-mienš poŭnaha narysu historyi Biełarusi nie chapaje nam h. zv. pary zaniapadu (XVII i XVIII stahodździ) i samych vytokaŭ biełaruskaha adradžeńnia (pačatku XIX st.). Ale voś sioleta jakraz vyjšla z druku novaja praca Ad. Stankieviča p. n. *„Mahnušeŭski—Paŭluk Bachrym—Babroŭski“*, u katoraj aŭtar razhladaje časy vytokaŭ biełaruskaha adradžeńnia. U knižcy henaj sabrana šmat cennych i cikavych matarjałaŭ, jakija kidajuć śviatło na pačatki biełaruskaha adradžeńnia. Dyk voś skarystajem z hetaj knižki i nižej pastarajemsia z jaje zrabić vypiski, katoryja mahčymuć šmat kamu pamahčy ŭ pracy nad paznavańniem svaje historyi.

* * *

Paśla taho, jak Vialikaje Kniastva Litoŭskaje, a razam z im i Biełaruś, u 1569 h. ŭ Lublinie padpisała z Polščaj palityčnuju Uniju i paśla taho, kali ŭ 1596 h. ŭ Bieraści nastupiła unija carkoŭnaja,—pačaŭsia zaniapad palityčny j kulturny Biełaruskaha Narodu. Hety zaniapad akančalna nastupiŭ u 18 stahodździ. Kali ŭ pačatku 19 stahodździa (traktat u Tylzicie 1807 h.) usie biełaruskija ziemli ad Polščy adyjšli da Rasiei, biełaruskaja kultura była źniščana i zaniapała akančalna. Tak zvanyja „vyšejšyja" słai biełaruskaha narodu, heta znača pany, duchavienstva, a navat i miaščanstva pakinuli biełaruski narod, biełaruskuju movu, kulturu, a mnohija navat i vieru i pieranialisia całkom kulturaj polskaj. Taja ŭznoŭ častka hetaha „vyšejšaha" biełaruskaha hramadzianstva, jakaja trymałasia pravasłaŭja i duchova za Polščaj nie pajšła, paviarnuła ŭ bok adnaviernaj Rasiei, jaje kultury i movy. Asabliva jarka heta zaznačyłasia, zrazumiełaja reč, u 19 stahodździ, kali ŭsia Biełaruś apynułasia pad Rasiejaj.

Ahułam-ža viernym Biełarusam astaŭsia biełaruski sialanski narod, nia hledziačy navat na toje, da čaho jaho mačycha—historyja dałučyła: da polskaha katalictva, ci da rasiejskaha pravasłaŭja. Znakam hetaj viernaści Biełarusi ŭ našym narodzie była i jość jaho heroičnaja viernaść svajej biełaruskaj movie. Voś-ža svaju rodnuju movu, jak znak žyćcia, jak zadatak na lepšuju budučyniu, biełaruski narod vierna pierachoŭvaŭ i pierakazvaŭ z pakaleńnia na pakaleńnie, čakajučy zary, čakajučy ŭschodu sonca, čakajučy pary svajho narodnaha adradžeńnia.

Narešcie nastaŭ i hety čas, urešcie ŭzyjšła nad narodam zara jaho lepšaj doli. I dziŭna! Budzić z doŭhaha snu biełaruski narod pačali jakraz tyja, što kałychali jaho da snu: biełaruskaja apalačanaja šlachta i z takoj-ža šlachty rodam — katalickaje duchavienstva abudvych abradaŭ — łacinskaha i słavianskaha (unijackaha).

Pačatki biełaruskaha nacyjanalnaha adradžeńnia biełaruskija historyki adnosiać da pačatku 19 stahodździa, zaznačajučy adnačasna, što pieršyja bolš-mienš 30 hadoŭ hetaha stałodździa, — heta čas „niaśviedamaha" našaha adradžeńnia, heta čas, kali pačynalniki hetaha adradžeńnia, asabliva ŭ halinie litaratury j navuki, nia majučy biełaruskaj nacyjanalnaj śviedamaści, pačynali ŭ hetych halinach pracavać, kirujučysia niejkaj bližej nieaznačanaj luboŭju da ŭsiaho rodnaha, biełaruskaha.

Z hetaha nastroju da biełaruskaści vyras zaraz paśla 1812 h. pieršy biełaruski litaraturny tvor „Eneida". U hetym časie pačaŭ pisać pabiełarusku vieršy i apaviadańni polska-biełaruski paet, šlachcic z Viciebščyny Jan Barščeŭski (1790—1851), a nieŭzabavie (1828) vyras u škole łacinskaha ksiandza Mahnušeŭskaha *pieršy biełaruski sialanski paet* Paŭluk Bachrym i—ŭ tym-ža časie i paźniej (30-ja j 40-ja hady 19 st.) na nivie biełaruskaj navuki pracuje prafesar vilenskaha universytetu M. Babroŭski, unijacki śviaščeńnik i karystajecca žyvym biełaruskim słovam u navučańni narodu až da samaj svajej śmierci.

I Mahnušeŭski z svaim Bachrymam i Babroŭski z svajej navukovaj pracaj i z svaimi biełaruskimi kazańniami pryčynilisia da genezy, da vytokaŭ i pačatkaŭ sučasnaha nacyjanalna-śviedamaha biełaruskaha adradženskaha ruchu. Takim čynam abodva jany zasłužyli na toje, kab Biełarusy bolš ich šanavali i lepš znali.

Mahnušeŭski i Paŭluk Bachrym

Mahnušeŭski byŭ čałaviekam świetłym, vučonym, niejki čas jon vučyŭ dziaciej kniazia Macieja Radziviłła — Kastanta i Antaninu. Kali dzieci vyraśli, to staŭ niepatrebnym kniaziu i atrymaŭ bahatuju parachviju Krošyn, niedaloka ad Baranavič.

Ab sabie jon mała dumaŭ; dla siabie ks. Mahnušeŭski mnoha nie vymahaŭ. Chacieŭ pamahčy, skolki zdoleŭ, prostym ludziam. Dachodaŭ jon mieŭ niamała, dziela hetaha darma chryściŭ, vianćaŭ, a biadniejšym i hrašmi pamahaŭ. Byŭšy adzinokim, zžyŭsia sa svaimi ludźmi, zvyksia z imi, pieraniaŭ ich movu, spraściеŭ, jak ab im kazali haradzkija i dvornyja pany, dy dzivavalisia, što jon havaryŭ „mužyckimi“ prykazkami i pahavorkami. Inšyja navat dumali, što jon nia ŭ poŭnym rozumie. Heta tak im zdavałasia. Mahnušeŭski byŭ čałaviek razumny: zbližyŭšysia da narodu, jon chacieŭ padniać hety narod, šyryć aśvietu siarod jaho. Kali jon pryjšoŭ u Krošyn, znajšoŭ užo parachvijalnuju tam škołu, ale budynak akazaŭsia niavyhodny; jon pabudavaŭ novy budynak, abšyrniejšy i lepšy za pieršy.

Sam jon zaŭsiody ŭ škole nia vučyŭ. Vučycielem byŭ arhanisty Arłoŭski, abo jaho pamocnik, stary kaścielny dzied — Parafijanovič. Ale vidać, što jon sam cikaviŭsia škołaj. Hladzieŭ za vučniami, interesavaŭsia ich postupami, asabliva bolš zdolnymi pamiž imi.

U 1828 h. ŭ škole było 51 vučniaŭ, z ich 35 chłopčykaŭ i 16 dziaŭčynak, uzrostam ad 7 da 13 hadoŭ. Vučyli ich tam čytać, pisać, ličyć i katechizmu. Šmat kłaŭ pracy kala škoły pamocnik probaršča ks. Pius Harbačeŭski, katory chacieŭ navučyć sialanskich dziaciej usiaho taho, čaho vučać pa druhich škołach panskich dziaciej. Jon čytaŭ im kazki Ezopa, polskaha paeta Naruševiča i „Wiadomości brukowe“, katoryja vychodzili ŭ Vilni i ŭ katorych nia raz pisali ab drennym pałažeńni sialan i ab patrebie skasavać panščynu. Chacieŭ jon, jak z hetaha vidać, zrabić z sialan dumajučych ludziej.

Vučni hetaj škoły, čytajučy toje, što pisali vialikija piśmieńniki, pieražyvajučy toje, što i jany, chacieli hetak sama napisać niešta padobnaje da taho, što čytali i pieražyvali. Chłopčyki pačynajuć pisać vieršy, jany to starajucca pisać na spadobu tych aryhinałaŭ, što čytali, to znoŭ probujuć napisać svajo, biaručy toje, što jany sami čuli i bačyli. Z liku hetkich chłopčykaŭ viedamy nam tolki adzin, Pavał Bachrym. Budučy ŭ školi, jon vielmi spadabaŭ pisać vieršy. Paŭluka, pačynajučaha dumać, dušyła ciažkaja mužyckaja dola, i hareli vočki, kali pierapisyvaŭ słovy i vieršy ab mužyckaj svabodzie. Viedajučy, što heta ŭ druhich krajoch možna, taho-ž žadali jany i ŭ siabie.

Ale voś miž ułaśnikami Krošyna paŭstała nieparazumleńnie i spor, u jaki ŭmiašałasia carskaje načalstva. Najbolš-ža na hetym paciarpieli niavinnyja sialanie, jakija adbyvali ŭ Krošynie panščynu i katorych abvinavačvali ŭ buncie. (A ŭ hetyja časy na Biełarusi jakraz šmat dzie adbyvalisia sialanskija bunty suproć panščyny i carskaj ułady). Tady carskija ŭłady i pany sudzili sialan i adnačasna źviarnuli ŭvahu na škołu ks. Mahnušeŭskaha, katoramu zrabili zakid, što jon byŭ pryčynaj buntu sialan u Krošynie. Pačałosia śledztva ab škole, revizii i ŭ adnaho z chłapcoŭ, Bachryma znajšli vieršy, jakija nie padabalisia carskaj uładzie. Tymčasam Mahnu-

šeŭski pradstaŭlaŭ Bachryma ŭ najlepšym światle.

Vynikam usiaho hetaha było zakryćcio škoły; ks. Mahnušeŭskaha ŭziali pad nadzor vajennaj kamandy, a paśla addali pad nadzor palicyi.

Byŭšy pad nadzoram, prybity horam, pamior ks. Mahnušeŭski 24 śniežnia 1828 hodu, majučy kala 70 hadoŭ.

Bachrymu jość tolki try: „Zahraj, zahraj, chłopča mały", „Hutarka Daniły z Ściapanam" i „Razmova pana z mužykom". Značeńnie ich u tym, što jany pajšli ŭ narod i słovam svaim biełaruskim budzili nacyjanalnuju śviedamaść, a źmiestam śviedamaść socyjalnuju. „Jon — praŭdu kaža ab Bachrymie M. Harecki*)—naš pieršy piśmieńnik z mužykoŭ. Mieŭ usie



Ks. Mahnušeŭski

23.I.1829 hodu carskija ŭłady razhledzieŭšy ŭsiu spravu pryznali Mahnušeŭskaha nievinavatym, ale ks. Mahnušeŭski nia moh ŭžo hetaha pačuć.

Niekatorych sialan sasłali ŭ Sybir. Paŭłu Bachryma zdali ŭ sałdaty. Viarnuŭšysia z vojska Paŭluk Bachrym žyŭ byccam dalej u Krošynie i pamior u 1891 h.

Usich vieršaŭ viedamych i jakija našyja historyki prypisvajuć zadatki, kab stacca biełaruskim Šeŭčenkam**), ale adsutnaść adukacyi i žyćciovaje hnibieńnie tut pieramahli. Usio-ž-taki svaim małaśviedamym i zadušanym słovam skazaŭ praciŭ žniavahi i ŭcisku i kinuŭ śled u historyi nacyjanalnaha i litaraturnaha adradžeńnia".

(d. b.)

*) „Гісторыя Беларускай Літаратуры. Вільня 1921, бач. 62.

**) Šeŭčenka — heta najvialikšy ukrainski paet.

Аб прычынах беспрацоўя і эканамічным крызысе

(Да справы „плянаваньня ў народнай гаспадарцы").

(Працяг, гл. „Шлях Моладзі" № 7 (106).

Як мы раней ужо зазначылі, разьвіцьцё буйнай прамысловасьці руйнавала дробных гаспадароў. Людзі *трацілі собскія варстаты працы і не заўсёды знаходзілі працу* ў капіталістычных фабрыках. Страта варштатаў працы дробных гаспадароў сталася агульнай у XX-м стагодзьдзі, калі капіталізм і тэхніка сільна разьвіліся.

Пры буйным узросьце тэхнікі машына ўсё больш і больш заменьвала работніка, работнік „удасканальваўся", змушаючы сябе абслугоўваць што раз больш станкоў, дзякуючы гэтаму лік працуючых у фабрыках паступова зьмяншаўся і частка работнікаў была „непатрэбнай", аставалася беспрацоўнай.

Выдайнасьць працы работніка ўзрастала, а дзякуючы дастатку рабочых рук і магчымасьці паміж імі канкурэнцыі, *заработная плата не павялічвалася,* а часам нават абніжалася, што памяншала набыўчыя здольнасьці рабочых, звужвала рынак і ў рэзультаце агранічвала прадукцыю, ды ўплывала на рост сталага беспрацоўя Сільныя гаспадарчыя аб'яднаньні капіталістаў—концэрны, трэсты, картэлі, сындыкаты— *дыктавалі рынку высокія цэны,* што таксама зьмяншала закупныя здольнасьці мас і адбівалася на прадукцыі.

Пасьля вайны наступіў *падзел рынкаў збыту,* у рэзультаце каторага некаторыя дзяржавы зусім утрацілі свае калёніі. Вялікія рынкі даўнейшай царскай Расейскай імпэрыі згубілі для Захаду вартасьць, бо там разьвілася свая прамысловасьць.—Гэтыя пэратасоўкі на рынках збыту моцна адбіліся на прамысловасьці, дзеля таго, што бракавала рынкаў — фабрыкі пачалі менш вырабляць тавараў, і працаваць з недагрузкай. І гэта йзноў уплыло на рост сталага безработцьця.

Вайна, ваенная блёкада навучыла, як важна мець у сваёй дзяржаве ўсе патрэбныя прадукты. І дзеля гэта ў кожнай дзяржаве паяўляецца вялікая цяга да *самавыстарчальнасьці.* Адсюль вельмі часта з значна большымі коштамі выпрабляюцца ў краі прадукты, якія раней прывозіліся з-за граніцы. Імкненьне да самавыстарчальнасьці памяншае сусьветныя рынкі, прычыняецца да падвышэньня цэнаў на тавары і гэтым самым паменшае набыўчыя здольнасьці мас ды ад'емна адбіваецца на стане агульнай вытворчасьці, а знача прычыняецца да існаваньня сталага беспрацоўя.

Вось галаўнейшыя прычыны існаваньня сталай арміі беспрацоўных у дваццатым стагодзьдзі, а асабліва ў пасьляваенны пэрыяд.

На фоне хранічнай хваробліваасьці гаспадаркі вельмі вострым і зацяжным быў цяперашні пераходны крызыс. Ён ахапіў усе капіталістычныя краіны бяз вынятку, усю гаспадарку, глыбока запусьціў свае кіпцюры нават у земляробства. Нячувана агромныя размеры прыняло беспрацоўе.—Бязумоўна, пры такіх шырокіх размерах беспрацоўя ў горадзе, абнізіліся набыўчыя здольнасьці сельска гаспадарчых прадуктаў, а ў рэзультаце ў некалькі разоў апалі цэны земляробскіх тавараў. Прамыслоўцы-ж, дзякуючы сіле сваіх аб'яднаньняў, міма так малога запатрэбаваньня на рынку, утрымалі цэны

на свае тавары на даволі высокім узроўні. Вытварылася вялікая разбежнасьць паміж цэнамі сельска-гаспадарчых і прамысловых прадуктаў. Затармазіўся адплыў лішніх рук з вёскі ў горад. Для сялянскай беднаты падзарабіць няма дзе. У параўнаньні з прамысловымі, сельска-гаспадарчыя прадукты страцілі сваю вартасьць. Пагаршэньне сялянскага быту біла таксама моцна па прамысловай вытворчасьці. Адно з другім вязалася, адно другое дапаўняла.

Беспрацоўе ўдарыла ў першую чаргу па маладым пакаленьні. Мала кваліфікаваныя маладыя работнікі хутчэй трацілі працу, чым іх старэйшыя браты і бацькі. Апынуліся безработнымі і шмат хто з інжынераў, тэхнікаў, дахтароў, дэнтыстаў, вучыцялёў, публіцыстаў, бугальтароў, бюралістаў... І гэта зразумела чаму. З закрыцьцём фабрыкаў вельмі многа інжынероў і тэхнікаў звольнена, а таксама зьліквідавана многа розных бюраў. Далейшага прыйма ня было, а маладыя сілы нарасталі. Безработны і зруйнаваны селянін ня можа пры тым сабе пазволіць на платную навуку дзяцей, належную лекарскую апеку, куплю газэткі, ці часам кніжкі. Бо гэта для іх люксус.

Пераходны крызыс, а таксама крызыс сыстэмы парадзілі фізычнае і ўмысловае беспрацоўе.

Дзе-ж выхад з беспрацоўя?

Беспрацоўя ня будзе тады, калі чалавецтва пяройдзе ад анархістычнай да пляновай гаспадаркі; значна зьменшыцца, калі земляробская культура падыймецца, калі будзе праведзеная *справядлівая зямельная рэформа* і калі будуць праводзіцца шырокія публічныя работы.

Т. Л.

Канец.

Жыд, Гэбрэй, Яўрэй і жаргон

Ня гледзячы на тое, што Жыды з Беларусамі жывуць ужо супольна больш 500 гадоў. дасюль адносна гэтага народу ў беларускай літаратурнай мове няма ўсталенага назову. Адны пішуць і называюць гэты народ Жыдамі, другія Яўрэямі, а трэція пробуюць пісаць Гэбрэі. На наш пагляд з усіх гэтых тэрмінаў найбольш адпаведным будзе слова Жыды.

— Чаму?—Таму, што Гэбрэі—гэта слова, як азначэньне нацыянальнасьці для Жыдоў ёсьць абразьлівым. Жыды яму прыдаюць такое самае значэньне, як у польскай мове слову „Ізраэліта,“ каторае яны ўважаюць за абразьлівае. Слова Еўрэй, Яўрэі — здаецца для Жыдоў прыемнае, яго нават ужываюць адносна Жыдоў у Савецкай Беларусі, але гэтае слова для Беларусаў чужое, яго народ ня ўжывае, а прыйшло яно да нас з Расеі.

Слова Жыд, Жыды у вуснах Беларусаў адносна жыдоўскага народу мае характар зусім паважны, яго ўжывае народ, яно мае традыцыю, а прыйшло да нас з захаду Эўропы. Жыд—палаціне: *Judacus*(юдакус), панямецку: *Jude* (юдэ), пафранцуску: *juif* (жуіф); паангліцку: *Jew* (джу). Дзеля гэтага ўважаем, што Беларусам абмінаць у друку слова Жыд і замяняць яго ненармальным для нашае мовы, чужым: Яўрэй ці абразьлівым для Жыдоў словам Гэбрэй няма абсалютна ніякай патрэбы. Недапушчальным, ясна, мусіць быць у беларускай мове і слова жаргон, што мела-б абазначыць жыдоўскі язык, бо гэтым ня толькі будзем разьмінацца з праўдай, абражаць Жыдоў, але выяўляць нястачу пашаны да іншых моваў.

Я—к.

Na pamiatnik Antonu Levickamu ŭ Vilni
achviaravali:

Aniščyk Alaksiej 5 zł., Michał Halasievič 20 hr., M. Milučanka 2 zł., U. Samojła 3 zł., A. Łuckievič 2 zł., M. Šutavičanka 3 zł., Kazłoŭski 50 hr., Ćvičkoŭski Anton 40 hr., Žuk Aleksandar 1 zł., Jelinski Michał 2 zł., Braty Kastuś i Lavon Paŭli 1 zł. 50 hr., Ks. Fr. Čarniaŭski 30 zł., P. Karosas 5 zł., Jazep Dulka 50 hr., V. Jermałkovič 50 hr., Amb. Marcinkievič 30 hr., P. Ziankievič 30 hr., V. Łatyšovič 30 hr., Bal. Krupičojć 25 hr., Ih. Dubroŭski 20 hr., J. Baryłovič 20 hr., Inž. L. Dubiejkaŭski 3 zł., Vł. Šaramet 1 zł., J. Korčyk 1 zł., P. Ramanovič 50 hr., Nikanor Kiško 50 hr.

Tych, što žadajuć, kab mahiła słaŭnaha biełaruskaha piśmieńnika i dziejača Antona Levickaha mieła naležny vyhlad i dahetul jašče nie zlažyli svaje achviary, prosim heta zrabić jak najchutčej.

Usim achviaradaŭcam składajem ščyruju padziaku.

Red. Kalehija „Šlachu Moładzi“.

Z žyćcia bratnich narodaŭ

U Litoŭcaŭ.—Vandroŭny aboz litoŭskich skaŭtaŭ, ab jakim pisali my ŭ № 7 „Šl. Moł.“, tryvaŭ sioleta nia doŭha. Pry tym tak niejak składałasia, što dzie prychodzili litoŭskija skaŭty, tam zaraz źjaŭlałasia palicyja...

— Aryštavany viasnoju staršynia b. Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu ŭ Vilni hram. K. Stašys, vialiki pryjaciel litoŭskaje moładzi, siadzić u vastrozie na Łukiškach u Vilni i čakaje na sudovuju raspravu, katoruju jamu pryhataŭlajuć polskija sudovyja ŭłady.

U Ukraincaŭ. — 6.VII.1937 h. u Lvovie pamior vydatny ukrainski małady paet Bohdan Ihor Antonyč. — 11.V.1937 h. u v. Kruhieli V., Peremyšlaŭskaha pav. pamior małady i talenavity ukrainski žurnalist, Stepan Sredačinški, jaki ŭ 1936 h. pačaŭ vydavać u Pieramyšli ukrainski časapis „Прорив“.

Viečnaja Im Pamiać!

— 5.VIII siol. administracyjnyja ŭłady raźviazali Ukrainski Spartovy Sajuz i Ukrainski Studencki Spartovy Klub u Lvovie. 10 h. m. tyja-ž ułady raźviazali Ukrainski Ramieśnicki Spartovy Klub.

— „Громадський Голос“ (№ 31 z 14.VIII.37) padaje, što ŭ Sakolščynie i Sambirščynie raźviazali ŭłady 12 čytalniaŭ „Просвіты“.

Praktyčnyja rady

Jak zatrymać kroŭ. Kali čałaviek zranicca i nia maje jodu, to kroŭ možna zatrymać mačajučy kusok vaty ŭ haračuju čystuju vadu i prykładajučy da rany. Ad hetaha kroŭ zaraz pierastaje ciačy.

Čamu ahurki byvajuć horkimi. Horki smak ahurkoŭ zaležyć ad biespasiaredniaha dziejańnia sonečnych pramieńniaŭ na płady. Dziela taho, kab ahurki nie nabirali horkaha smaku, treba, kab ich płady raśli ŭ cieni, pad listočkami.

Jak pramyvać voka, na jakoje pyrsnuła vapna. Voka zaciarušanaje vapnaj nikoli nia možna pramyvać čystaj vadoj, bo tady jašče horš budzie baleć i piačy i moža ahułam spalić sietku voka. Treba pramyvać vadoju zasałodžanaju cukram.

З КРАЮ

Культурная праца на вёсцы.

в. Падлесьсе, Баранавіцкага пав. У нядзелю 1 жніўня мясцовая моладзь наладзіла спэктакль-вечарыну. Адыграна была опэрэтка „Перашкода". Артысты-аматары ролі свае выканалі нагул добра, хоць былі некаторыя недахопы. Асабліва добра былі адыграны ролі: Ганны (В. Смаршчанка), Домны (Н. Смаршчанка), Трахіма (А. Хведчык) і Астапа (С. Таранда). Адумыслова да спэктаклю сарганізаваны хор зьвярнуў увагу вельмі добрым выкананьнем прыгожых песьняў.

Моладзі і старэйшых сабралася шмат. Вечарына весела і ў поўным парадку працягнулася да раніцы. Даход празначаны на будову школы ў в. Падлесьсі.

Трэба адцеміць, што моладзь арганізуючая спэктакль была змушана палажыць нямала працы і перамагчы не адну перашкоду. *Л.*

Весткі з Тарнапольскай вол., Ваўкавыскага пав.

Поўнае нацыянальнае сьведамасьці сярод жыхароў нашае воласьці, можна сказаць, што йшчэ няма. Шмат ёсьць цемры, боек, п'янства і г. д., але ёсьць і такая моладзь, што ахвотна чытае беларускія кніжкі, часапісы, цікавіцца культурным жыцьцём і ведае, што гарэлка не дае нам ніякае карысьці, а прыносіць згубу. Польскія арганізацыі ў масах у нас уплываў бадай зусім ня маюць, хоць рознымі спосабамі, асабліва моладзі, стараюцца іх прышчапіць.

Летась быў сарганізаваны ў в. Луцэ Праф. Саюз Драўляных Работнікаў, каторы даў не малую карысьць для эксплёатаваных плытнікаў (у нас завуць іх *арэлі*) у пераможнай забастоўцы на рэчцы Нарве, пры сплаве дзерава. Тады плытнікі дабіліся добрай цаны і варункаў працы, але адначасна Саюз уладамі быў зьліквідаваны, ня гледзячы на просьбу болей як 500 сяброў гэтай арганізацыі, пазволіць гэнаму Саюзу далей легальна працаваць.

Пасьля гэтага капіталісты пачалі йзноў выкарыстываць малазямельных сялян, каторыя пераважна працуюць пры сплаве. Але сяляне, зразумеўшы значэньне арганізацыі, у м-цы ліпні сёлета залажылі ў в. Баўтрукі новы свой Прафэсыянальны Саюз, які мае бараніць іхнія інтарэсы. *Ж.*

«II-гі Палескі Ярмарк у Пінску»

Пад гэткім назовам 22.VIII сёлета ў Пінску распачалася імпрэза, якая будзе трываць да 5.IX. „Ярмарк" меў быць нібы выстаўкай Піншчыны, але з сапраўднасьцяй яна вельмі разьмінаецца. Так між іншым на „ярмарку" стаіць хата, што мае быць палескаю, хоць фактычна на ўсім Палесьсі толькі на выстаўцы можна гэткую спаткаць. Сапраўды палескаю была толькі тканіна.

Недалёка гэнае хаты стаіць „лялька" апранутая ў народную ношу, але няведама ці праз недагляд, ці спэцыяльна твар „лялькі" такі страшны, што глядзець гадка. А тымчасам яна прадстаўляе тып паляшучкі.

Цікавы для характэрызацыі аддзел з напісам „Polesie" з рознымі дыяграмамі і фатаграфіямі. На фатаграфіях відаць аднак перад усім урадавыя будынкі і да іх дарогі. Іншыя аддзелы гэта сапраўды „ярмарк" (кірмаш): шум і крык розных таргоўцаў.

Каля „ярмарку" ёсьць і „Вясёлае Мястэчка" з рознымі тыпамі, а праявы ў ім зусім не вясёлыя.

Паляшукі глядзяць на ўсё гэта і сумна ківаюць галовамі... *Х. У.*

ХРОНІКА

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

— Новая спроба стварэньня арганізацыі беларускай моладзі. Сярод беларускай моладзі ў Вільні паўстала думка йзноў старацца стварыць і залегалізаваць арганізацыю беларускае моладзі. Дзеля гэтага ўжо апрацоўваецца статут, які будзе паданы на зацьверджаньне адміністрацыйным уладам. — Усе дасюлешнія натугі беларускае моладзі дзеля стварэньня свае арганізацыі разьбіваліся на адмовах адміністрацыйных уладаў легалізаваць іх.

— Ліквідацыя Саюзу Беларускіх Вучыцялёў. 20.VIII сёлета Віленскі Ваявода выдаў загад ліквідацыі Саюзу Беларускіх Вучыцялёў у Вільні. Як бачым, яшчэ адна ліквідацыя прыбыла...

— Немцы цікавяцца Беларусамі. Вышэйшая Заграніная Нямецкая Школа ў Бэрліне на найбліжэйшы час апрацавала абшырную праграму вывучэньня Беларусі. Адзін з прафэсароў гэтае Школы быў анагдай у Вільні і шукаў тут адпаведнай літаратуры для бібліятэкі Школы. За апошнія два месяцы ёсьць гэта ўжо чацьвертыя адведзіны нямецкіх вучоных і студэнтаў у віленскіх беларусаў. Гаворыць гэта аб тым, што немцы цікавяцца беларускай справай. Сярод Палякоў ёсьць-жа яшчэ людзі, якія хочуць Беларусаў схаваць...

— Мэморыял Б.Н.К. у справе беларускага ліцэю. 14.VIII адбыўся агульны сход Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, галоўным пунктам нарадаў якога была справа адчыненьня ў Вільні беларускага ліцэю. 16 г. м. БНК выслаў у гэтай справе да Польскага Ураду мэморыял.

— Зьмена памешчаньня бел. гімназіі. Беларуская Філія пры Гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні сёлета летам зьмяніла памешчаньне і цяпер месьціцца пры Дамініканскай вул. 3.

—Канфіската. 12.VIII Віленскае Гарадзкое Староства сканфіскавала № 12 беларускага гаспадарскага часапісу „Самапомач" за артыкул „Абое рабое" (аб коопэрацыі).

— Беларуская песьня багацее. Кампазытар К. Галкоўскі апрацаваў шэсьць народных беларускіх песьняў для аднаго голасу з акампаньямэнтам фортэп'яну. Мэлёды і тэксты песень, узятыя з рукапісаў грам. Р. Шырмы, запісаныя: дзьве ў вёсцы Кацёлкі, Пружанскага павету — „Ой дождж ыдзе, раса нападзе" (восень) і „Ой у полі дзьве пташачкі, обе рабакрылы" (ракруцкая), адна ў м-ку Мядзела, Пастаўскага павету — „Кукавала зязюлька, што лес мал" (вясельная, жартаўлівая), адна у в. Нізяны, Ваўкавыскага павету — „На гарэ камары, а ў даліні гусі" (гумарыстычная), адна ў в. Новасёлкі, Паст. п.— „Купальле-лё", і „Чэраз сад вінаград па ваду хадзіла" — прыпеўкі з Наваградчыны.

—„Беларускі Адрыўны Каляндар на 1938 г." ужо друкуецца і хутка выйдзе ў сьвет. Выдаюць яго па даўнаму тры беларускія кнігарні ў Вільні: „Пагоня" — Завальная 1, Стан. Станкевіча — Астрабрамская 2 і „Надзея" — Астрабрамская 1.

—Новая беларуская опэра. Беларускі савецкі пісьменьнік Пятрусь Броўка напісаў лібрэтто (словы) новай беларускай опэры. Дзея опэры адбываецца на фоне сусьветнай і грамадзянскай вайны. У лібрэтто выкарыстана шмат фольклёрнага матарыялу. Музыку опэры піша кампазытар Е. Цікоцкі. Ставіць опэру будзе Беларускі тэатр опэры і балету.

— Цэнны падарак. Унівэрсытэцкая бібліотэка ў Коўне, (кіраўніком каторай ёсьць праф. Вацлаў Біржышка) 10.IV.37 аддала беларускім студэнтам, што вучацца ў ковенскім унівэрсытэце, 15 тысяч экзэмпляраў розных беларускіх кніжак.

Гэтыя кніжкі выдала ў сваім часе Беларускае Выдавецтва, якое было сарганізавана пры Міністэрстве беларускіх спраў. Пасьля ліквідацыі Міністэрства, кніжкі апынуліся ў літоўскім міністэрстве заграніных спраў, якое некалькі год таму назад перадало іх унівэрсытэцкай бібліотэцы.

Беларускія студэнты аддалі кніжкі Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту ў Коўне, дзеля безграшовай перадачы іх беларускім арганізацыям і паасобным Беларусам у Літве.

— Беларус скончыў Рыскі Унівэрсытэт. Сёлета скончыў агранамічны факультэт латвійскага унівэрсытэту ў Рызе грамадзянін Казімер Мяжэцкі, з крыві і косьці дзейны Беларус. Грам. Мяжэцкі прыймаў жывое ўчасьце ў беларускім грамадзкім жыцьці. Доўгі час быў старшынёю Цэнтр. Управы найвялікшай беларускай арганізацыі ў Латвіі—Т-ва Беларускае Моладзі, сябрам Ц. У. Т-ва Беларускіх Вучыцялёў і Беларускага Тэатру ў Латвіі.

Грам. К. Мяжэцкаму перасылаем прывітаньне і сардэчнае зычэньне далейшай плоднай працы на беларускай ніве.

US IAČYNA

— U sanacyjnym abozie ŭ Polščy nieładу. Paśla źjezdu lehijanieraŭ u Krakavie 15.VIII vyrazna vyjavilasia, što sanacyjnaja levica nia choča jści ŭ OZN, z jakoha ŭžo vystupiŭ „Legion Młodych". „Strzelec" naviazaŭ supracoŭnictva z Sajuzam Pol. Vučycialoŭ, katoramu, asabliva ksiandzy, zakidajuć lišni radykalizm. Nia jdzie ŭ OZN, pravaja kaliś ruka Marš. Piłsudzkaha i arhanizatar B.B., pałk. Slavek. PPS i „Ludowcy", jakija ad 15 da 25 žniŭnia ładzili sialanski strajk niedastaŭlajučy da miestaŭ praduktaŭ,starajucca stvaryć supolny front. Da ich u niekatorych miascoch dałučajecca sanacyjnaja levica. Heta šmat kamu nahaniaje strachu... Strachu nahaniaje palitykam i dumka stvareńnia ŭ Polščy bloku nacyjanalnych mienšaściaŭ, ab čym časta piša žydoŭskaja i ukrainskaja presa.

—8.VIII ŭ Varšavie adbyŭsia 29 Mižnarodny Kanhres Esperantystaŭ. Byli na im pradstaŭniki 30 narodaŭ. Esperanto—heta nazoŭ štučnaje mižnarodnaje movy, jakuju vydumaŭ dr.Zamenhof z Biełastoku u 1897 h. Jošć jana vielmi lohkaja,a składajecca z vybranych słoŭ z jazykoŭ: łacinskaha, francuskaha, niamieckaha, a tak-ža jazykoŭ słavianskich. Dahetul paesperancku vydana 5000 knižak i vychodzić 80 čas.

— Danija maje krychu bolš jak 3 milijony žycharoŭ. Čytańnie-ž časapisaŭ tam tak pašyrana, što adzin ekzemplar časapisu prypadaje na 3 žycharoŭ. — A jak u nas? — Lepš i nie havaryć...

— Abisynija nie paddajecca. Tam uściaž tryvaje partyzanckaja vajna. U m-cy červieni sioleta zhinuła ŭ Abisynii 59 itatalijanskich achvicieraŭ i žaŭnieraŭ, siarod jakich było 6 latunoŭ. Chodziać navat pohałaski, što Musolini, kab uspakoić Abisyniju, prapanavaŭ Negusu viarnucca ŭ Abisyniju i zaniać tron, ale padparadkavacca Italii. Negus adnak admoviŭsia heta zrabić.

— U Litvie prysudy śmierci dla prastupnikaŭ buduć vykonvać dalej pry pomačy trujučych hazaŭ.


— U Turcyi zbuntavaŭsia paniavolenу jeju narod Kurdy. Lik paŭstancaŭ dachodzie da 100 tysiač asob. Dziela ŭśmireńnia buntu turki vysłali praciŭ kurdaŭ 30 tysiač rehularnaha vojska.

— U Rabotnickaj Spartovaj Olimpijadzie, jakaja adbyłasia ŭ pačatku žniŭnia ŭ Belhii, brała ŭčaście 22,000 čałaviek.

— U Halandyi na pačatku žniŭnia sioleta adbyŭsia mižnarodny skaŭcki źjezd — Jamboree (džembori).

— U Kitaju vajna što-raz bolš razharajecca. Hałoŭnyja bai ciapier iduć kala Šanhaju. Pekin japoncy daŭno ŭžo zabrali. Kitaj kansalidujecca i hatovicca da adporu, dajučysia časta davoli dobra ŭ znaki japoncam.

—U Hišpanii zaŭvažvajecca pieravaha paŭstancaŭ, jakija 25.VIII zabrali adno z najpryhažejšych baskijskich miestaŭ Santander (na źnimcy).Madryt dalej baronicca.



Baskijskaje miesta SANTANDER.

Zahinuŭ słaŭny saviecki latun Levanieŭski

Paśla dvoch udałych pieralotaŭ savieckich latunoŭ z Maskvy ŭ Ameryku na samalotach marki „ANT—25", słaŭny saviecki latun Levanieŭski chacieŭ treci raz pieralacieć na samalocie inšaj kanstrukcyi. Adnak mima taho, što šmat času prajšło ad jaho adlotu z Maskvy, nijakich viestak ab im nia było čuvać. Dziela hetaha pačali jaho šukać. Dahetul adnak nichto na jahonyja śłady nia trapiŭ. U pošukach, jakimi kiruje praf. O. Šmidt, katory paśla ŭnarmavańnia pracaŭ navučnaje ekspedycyi na paŭnočnym polusie viarnuŭsia ŭ Maskvu, biaruć učaście najlepšyja savieckija latuny, a taksama słaŭny anhlijski padarožnik Wilkins i amerykanski latun Metern, jakoha kaliś u časie katastrofy na poŭnačy vyratavaŭ Levanieŭski.

PAŠTOVAJA SKRYNKA

A v u s u: Vieršy, nažal, słabyja. Kulje mova i raźmier nia vytrymany. Bolš čytajcie pryhožaje biełaruskaje litaratury i pryhladajciesia, jak druhija pišuć.

P. Ł.: Atrymali, ščyra dziakujem. Moža Vy byli-b łaskavy i naładzili z henymi redakcyjami abmienu časapisami z „Šlacham Moładzi". Pryvitańnie!

K. I.: Vieršy słabyja, talent adnak jość, dyk treba pracavać, a buduć i lepšyja.

Л.: Карэспандэнцыю друкуем і просім пісаць часьцей.

Р. Б у л ь б а е д у: Апавяданьне атрымалі, будзем разглядаць і старацца выкарыстаць.

Ж: Карэспандэнцыю, як бачыце, зьмяшчаем. Просім пашыраць у сваей старонцы „Шлях Моладзі".

Я. П.: Апавяданьне „Парадзіў" слабаватае як стылем, так і мовай. Будзем старацца яго паправіць і надрукаваць увосені. Шырэйшай крытыкі кожнага твору ня можам рабіць з прычыны нестачы месца.

Х. У.: Уражаньні з „ярмарку" скарацíўшы друкуем. Просім пісаць часьцей.

Krychu śmiechu.

U sudzie.

— Ci abvinavačany pryznajecca da viny? — pytajecca sudździa.

— Nie, panie sudździa, bo prad chvilinaj pan advakat pierakanaŭ mianie svajej pramovaj, što ja nie vinavaty.

Aščadnaść.

— Tatu, što heta takoje aščadnaść?

— Vidziš, synok, aščadnaść palahaje na tym, kab što-dzień adkładać hrošy, a paśla imi... zapłacić padatak.

Часапіс рэдагуе Рэдакцыйная Калегія.

Друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная 1-2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я.Найдзюка і А. Шутовіча.

Выдавец: „БЕЛПРЭС". Рэдактар Я. НАЙДЗЮК